# *§ 4–0. Асаблівасці развіцця краін Захаду і Усходу ў другой палове XIX — пачатку XX ст.

МАНАРХІЯ РЭСПУБЛІКА
ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ
УРБАНІЗАЦЫЯ
ПРАМЫСЛОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ТРАДЫЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА
КАЛАНІЯЛЬНАЯ ЭКСПАНСІЯ
НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ

**1. Асноўныя формы буржуазнай дзяржавы: канстытуцыйная манархія, прэзідэнцкая і парламенцкая рэспубліка.** У другой палове XIX — пачатку XX ст. аформіліся асноўныя формы буржуазнай дзяржавы: канстытуцыйная манархія, прэзідэнцкая рэспубліка і парламенцкая рэспубліка.

Формы дзяржавы, што склаліся ў XIX ст., захоўваюцца і сёння.

**2. Палітычныя ідэалогіі: кансерватызм, лібералізм, сацыялізм.** Пад уплывам зрушэнняў Вялікай Французскай рэвалюцыі канца XVIII ст. і Напалеонаўскіх войнаў вялікае пашырэнне ў людской свядомасці атрымала жаданне грамадскай стабільнасці, вяртання да традыцыйных каштоўнасцей. **Ідэалогіяй**, якая адлюстроўвала гэтыя настроі, выступіў *кансерватызм*. Найбуйнейшымі прадстаўнікамі кансерватыўнай ідэалогіі былі англічанін *Э. Бёрк* і выхадзец з П'емонта *Ж. дэ Местр*. Кансерватары разглядалі няроўнасць паміж людзьмі як натуральны стан рэчаў, выступалі за захаванне звычаяў і традыцый, сацыяльных інстытутаў, якія

Прывядзіце прыклады сучасных дзяржаў — канстытуцыйнай манархіі, парламенцкай рэспублікі, прэзідэнцкай рэспублікі.

**Ідэалогія** — сістэма палітычных, прававых, маральных, філасофскіх поглядаў і ідэй, у якіх адлюстроўваецца стаўленне людзей да рэчаіснасці.

Кансерватызм

## ФОРМЫ БУРЖУАЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў XIX ст.

| Канстытуцыйная манархія | Парламенцкая рэспубліка | Прэзідэнцкая рэспубліка |
|---|---|---|
| Вялікабрытанія, Іспанія, Партугалія, Бельгія, Нарвегія, Швецыя, Данія, Італія | Францыя (ад 1870 г.), Швейцарыя (ад 1848 г.) | ЗША, Бразілія (ад 1889 г.), Аргенціна |
| Улада манарха абмежаваная канстытуцыяй і парламентам | Галоўная роля ў кіраванні краінай належыць парламенту | Форма праўлення, што характарызуецца моцнай прэзідэнцкай уладай |
| Заканадаўчая ўлада належыць парламенту і манарху, выканаўчая засяроджана ў руках урада. Урад фарміруецца парламенцкай большасцю і справаздачны перад ёю. Паўнамоцтвы манарха строга вызначаны і абмежаваны канстытуцыяй, што выключае яго самавольства | Выканаўчая ўлада фарміруецца парламенцкай большасцю, а кіраўнік дзяржавы (прэзідэнт) выконвае пераважна цырыманіяльныя функцыі. Парламент прымае асноўныя рашэнні і вызначае курс краіны. Урад залежыць ад парламента: кабінет міністраў прызначаецца парламентам і можа быць адпраўлены ў адстаўку ў выпадку страты даверу | Урад не залежыць ад парламента і фарміруецца прэзідэнтам. Заканадаўчая ўлада належыць парламенту, выканаўчая — ураду. Незалежнасць прэзідэнту надае той факт, што ён найчасцей абіраецца насельніцтвам і не адказны перад парламентам. Тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта фіксаваны |

Як вы лічыце, сярод якіх сацыяльных пластоў насельніцтва Еўропы больш прыхільнікаў кансерватызму? Чаму?

даўно склаліся. У якасці гаранта захавання традыцый яны разглядалі аўтарытэт манарха. Захавальнікам маралі была царква. Кансерватары бачылі сваю задачу ў тым, каб змагацца супраць рэвалюцый, супраць непажаданых, на іх думку, наваўвядзенняў. Пры гэтым Э. Бёрк заклікаў праводзіць рэформы, а не абапірацца толькі на сілу для забеспячэння стабільнасці ў грамадстве.

Пад уплывам ідэй Асветніцтва і Французскай рэвалюцыі паўстала ідэалогія *лібералізму*. Найбольш яскравымі яе прадстаўнікамі былі *Г. Спэнсар, Дж. С. Міль* у Вялікабрытаніі, *Б. Канстан, А. дэ Таквіль* у Францыі, *В. Гумбальт* у Германіі. Лібералы адстойвалі перадусім свабоду чалавека, недапушчальнасць у дачыненні да яго ніякага прымусу. Яны патрабавалі роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, свабоды веравызнання, слова, друку, права ўдзельнічаць у прадстаўнічых органах улады, у вырашэнні дзяржаўных пытанняў. Адначасова з гэтым лібералы даказвалі немагчымасць маёмаснай роўнасці паміж людзьмі. У эканоміцы яны адстойвалі свабоду канкурэнцыі. Барацьба за асабістыя свабоды часцяком перапляталася ў лібералаў з барацьбой за нацыянальную незалежнасць.

## Лібералізм

Ці згодныя вы з тым, што ідэалогія лібералізму выказвала інтарэсы маладога класа буржуазіі? Сваю думку абгрунтуйце.

У першай палове XIX ст. атрымалі развіццё ідэалогіі *сацыялізму* і *камунізму*. Для новага грамадства, якое прапаноўвалі сацыялісты, былі характэрныя адсутнасць эксплуатацыі, салідарнасць паміж людзьмі, справядлівае размеркаванне матэрыяльных даброт. Такія сацыялісты, як *К. А. Сэн-Сімон, Л. Блан*, галоўную ролю ў пераходзе да новага грамадства надавалі дзяржаве.

Камунізм як крайняя плынь у сацыялізме цалкам адпрэчваў прыватную ўласнасць, дасягненне роўнасці бачыў праз поўную агульнасць маёмасці і грамадскі кантроль за спажываннем. Агульнай у поглядах ранніх сацыялістаў была адмова ад гвалту. Іншы падыход да правядзення грамадскіх змен прапанавалі *К. Маркс* і *Ф. Энгельс*. Яны лічылі, што пераход да камуністычнага грамадства адбудзецца ў выніку класавай барацьбы і рэвалюцыі, якую мае ажыццявіць пралетарыят. К. Маркс і Ф. Энгельс назвалі сваё вучэнне «навуковым сацыялізмам» і супрацьпастаўлялі яго ранняму сацыялізму, які лічылі «ўтапічным».

## Сацыялізм і камунізм

Успомніце, што азначаюць эвалюцыйны і рэвалюцыйны шляхі развіцця грамадства. Чым яны адрозніваюцца? Прыхільнікі якіх ідэалогій выступалі за эвалюцыйны шлях, а якіх — за рэвалюцыйны?

Як вы лічыце, хто ў Заходняй Еўропе ў XIX ст. мог падзяляць погляды сацыялістаў і камуністаў? Сваю думку абгрунтуйце.



„Немагчыма кіраваць дзяржавай выпадкова. Кожны чалавек павінен займацца працай, якую ён ведае. Ідэя спадчыннай улады забяспечвае слушны прынцып перадачы ўлады, які захоўвае ўсе набыткі“.

Э. Бёрк, англійскі палітык і філосаф



„Усякае пашырэнне дзяржаўнай улады мае тое наступства, што гэтая ўлада ўзмацняе ўплыў на індывідуумаў, павялічвае колькасць людзей, якія ўскладаюць на ўрад свае спадзяванні і хваляванні, ператварае дзейных і амбітных членаў грамадства ў простых слуг дзяржавы“.

Дж. С. Міль, англійскі філосаф



„Найлепшы грамадскі лад — гэта той, які робіць жыццё людзей, што складаюць большасць грамадства, найбольш шчаслівым, даючы ім максімум сродкаў і магчымасцей для задавальнення іх найважнейшых патрэб“.

К. А. Сэн-Сімон, французскі філосаф



„Гісторыя ўсіх грамадстваў, якія існавалі да гэтага часу, была гісторыяй барацьбы класаў“.

К. Маркс, нямецкі філосаф

Прачытайце выказванні філосафаў XIX ст. Якія ідэалогіі яны адлюстроўваюць? Свой адказ аргументуйце.

**Палітычная партыя і партыйная сістэма**

**3. Палітычныя партыі.** *Палітычная партыя* — гэта аб'яднанне людзей з агульнымі палітычнымі ідэямі і інтарэсамі, якое імкнецца ўплываць на ўладу і ўдзельнічаць у кіраванні дзяржавай. Сукупнасць такіх партый, якія дзейнічаюць у краіне і ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, называецца *партыйнай сістэмай*.

Партыйная сістэма — гэта спосаб арганізацыі палітычнага жыцця ў краіне, пры якім розныя партыі змагаюцца за ўладу і прадстаўляюць інтарэсы розных груп грамадства. Партыі дапамагаюць людзям удзельнічаць у палітыцы: яны фармулююць ідэі

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ

## ЗАХАД

**партыі дзейнічалі ва ўмовах пашырэння выбарчых правоў і парламенцкіх сістэм**

У Вялікабрытаніі на працягу XIX ст. галоўнымі былі дзве партыі:
**Ліберальная партыя** — выступала за свабоду гандлю, рэформы, грамадзянскія правы;
**Кансерватыўная партыя** — выступала за захаванне традыцыі, моцную манархію, уладу арыстакратыі.

У 1900 г. утварылася **Лейбарысцкая партыя** — партыя працы, заснаваная прафсаюзамі. Яна прадстаўляла інтарэсы рабочых і неўзабаве зрабілася адной з вядучых палітычных сіл.

Пасля рэвалюцый XIX ст. у Францыі існавала некалькі палітычных кірункаў:
**рэспубліканцы** — за дэмакратыю і грамадзянскія правы;
**сацыялісты** — за інтарэсы рабочых;
**манархісты** — за захаванне старога парадку.

Найважнейшымі партыямі Германіі былі **Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ)**, якая выяўляла інтарэсы рабочых, і **Нацыянал-ліберальная партыя**, што адлюстроўвала інтарэсы буржуазіі. СДПГ ператварылася ў найбуйнейшую рабочую партыю Еўропы.

У ЗША зацвердзілася двухпартыйная сістэма:
**Рэспубліканская партыя** — за развіццё прамысловасці і ўмацаванне адзінства краіны;
**Дэмакратычная партыя** — за інтарэсы фермераў і гарадскіх рабочых.

## УСХОД

**партыі часцей узнікалі як рухі за нацыянальнае вызваленне, рэформы і абмежаванне абсалютнай улады манарха**

У Японіі ў 1880–1890-я гг. з'явіліся першыя партыі: **Ліберальная партыя** і **Канстытуцыйная партыя**. Абедзве партыі падтрымлівалі мадэрнізацыю і парламенцкія пераўтварэнні на заходні ўзор, дзейнічалі пад строгім кантролем імператара.

У Асманскай імперыі напрыканцы XIX ст. афарміўся рух младатуркаў, што стварылі партыю **«Яднанне і прагрэс»**, якая патрабавала канстытуцыйных рэформаў і абмежавання ўлады султана.

У гады канстытуцыйнай рэвалюцыі ў Іране паўсталі партыі і таварыствы, якія выступалі за ўвядзенне парламента (меджліса) і абмежаванне ўлады шаха.

У Кітаі ва ўмовах крызісу імперыі Цын фарміраваліся рэвалюцыйныя арганізацыі. Найбольшы ўплыў атрымала партыя **Гаміньдан (Нацыянальная партыя Кітая)**, створаная ў 1912 г. пад кіраўніцтвам **Сунь Ятсэна**. Яна выступала за звяржэнне манархіі, пабудову рэспублікі, мадэрнізацыю краіны і нацыянальнае адраджэнне.

У другой палове XIX — пачатку XX ст. у Індыі фарміраваўся нацыянальны рух, шчыльна звязаны з барацьбой супраць брытанскага каланіяльнага панавання. У 1885 г. быў створаны **Індыйскі нацыянальны кангрэс (ІНК)** — першая буйная палітычная арганізацыя краіны. Спачатку ён аб'ядноўваў пераважна адукаваную індыйскую інтэлігенцыю і прапаноўваў умераныя патрабаванні: пашырэнне ўдзелу індыйцаў у кіраванні, доступ да дзяржаўнай службы, паляпшэнне ўмоў жыцця. Паступова ў ІНК узмацнілася радыкальнае крыло, якое патрабавала самакіравання і незалежнасці. Напачатку XX ст. актывізавалася і мусульманская эліта: у 1906 г. утварылася **Мусульманская ліга**, якая выказвала інтарэсы мусульманскага насельніцтва і ў далейшым адыграла важную ролю ў падзеле Індыі і ўтварэнні Пакістана.

і праграмы, выстаўляюць кандыдатаў на выбары, кантралююць уладу.

У другой палове XIX — пачатку XX ст. у краінах Захаду і Усходу фарміраванне палітычных партый зрабілася важным элементам мадэрнізацыі грамадства.

**4. Змяненне сацыяльнай структуры.** У другой палове XIX — пачатку XX ст. сацыяльная структура заходніх краін зазнала значныя змены. Індустрыялізацыя і ўрбанізацыя паўплывалі на расстаноўку сацыяльных сіл, паспрыялі змяненню класавай структуры і фарміраванню новых грамадскіх груп.

**Рост колькасці рабочага класа**

Адным з ключавых працэсаў гэтага часу было імклівае павелічэнне колькасці пралетарыяту. Развіццё прамысловай вытворчасці патрабавала вялікай колькасці рабочых рук, што прывяло да масавага прытоку сельскага насельніцтва ў гарады. Рабочыя працавалі на заводах, фабрыках, у шахтах і на чыгунках, за нізкую заработную плату і без сацыяльных гарантый.

Як вы лічыце, чаму рабочыя партыі падтрымлівалі ідэі сацыялізму?

У адказ на складаныя ўмовы працы пачалася актыўная барацьба за правы рабочых. У гэты перыяд ствараюцца прафсаюзы, якія дабіваліся павышэння заработнай платы, скарачэння рабочага дня і паляпшэння ўмоў працы. З'яўляюцца рабочыя партыі, што выказваюць ідэі сацыялізму і абароны інтарэсаў пралетарыяту. У шэрагу краін прымаюцца законы аб працы, якія абмяжоўваюць дзіцячую працу, усталёўваюць мінімальныя сацыяльныя гарантыі і бароняць рабочых ад самавольства працадаўцаў.

**Умацаванне пазіцый буржуазіі**

Буржуазія, што складалася з прадпрымальнікаў, прамыслоўцаў, банкіраў і гандляроў, у другой палове XIX — пачатку XX ст. канчаткова замацавала свой уплыў у палітычнай і эканамічнай сферах. Сярэдні і буйны́ бізнес рабіўся рухавіком эканамічнага росту, кантраляваў ключавыя галіны прамыслова-

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**Працягласць рабочага тыдня ў Еўропе і ЗША**

| Гады | Еўропа | ЗША |
|---|---|---|
| 1850 г. | 84 гадз | 72 гадз |
| 1910 г. | 60 гадз | 54 гадз |

1. *Прааналізуйце звесткі пра працягласць рабочага тыдня ў Еўропе і ЗША. Якія вывады можна зрабіць на падставе прадстаўленых звестак?*
2. *Вызначце фактары, якія паспрыялі скарачэнню працягласці рабочага часу ў XIX — пачатку XX ст.*
3. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся сярэднюю працягласць рабочага тыдня ў наш час. Зрабіце вывады.*

сці, банкаўскі сектар і гандаль. Прадстаўнікі буржуазіі актыўна ўдзельнічалі ў парламенцкай дзейнасці, прасоўвалі законы, якія баранілі прыватную ўласнасць і свабодны рынак.

Прыхільнікам якой ідэалогіі была буржуазія?

### Аслабленне пазіцый арыстакратыі

Арыстакратыя займала значнае месца ў грамадска-палітычным жыцці, але яе ўплыў паступова памяншаўся. У другой палове XIX ст. многія ўладальнікі буйной зямельнай уласнасці стралі свае землі і маёнткі, прадавалі або здавалі іх у арэнду прадстаўнікам буржуазіі. Парламенты і канстытуцыйныя рэформы абмяжоўвалі ўладу арыстакратыі на карысць буржуазіі. З цягам часу працэс пераразмеркавання ўлады і рэсурсаў усё ўзмацняўся.

### Культурныя змены

Для другой паловы XIX — пачатку XX ст. характэрнае пашырэнне буржуазных каштоўнасцей, прадпрымальніцкага духу і дэмакратычных прынцыпаў. Усё гэта аказвала ўплыў на грамадскія ідэалы, перасоўвала цэнтр уплыву ад дваранства да дзелавой эліты.

**Рост колькасці сярэдняга класа**

Адной з найважнейшых сацыяльных з'яў канца XIX — пачатку XX ст. было павелічэнне колькасці сярэдняга класа. У яго ўваходзілі адукаваныя спецыялісты: урачы, юрысты, інжынеры, выкладчыкі, чыноўнікі і прадпрымальнікі сярэдняга звяна. Іх уплыў на грамадства рос дзякуючы развіццю адукацыі, росту дзяржаўнага апарату, паляпшэнню ўзроўню жыцця. Прадстаўнікі сярэдняга класа атрымоўвалі стабільныя даходы, маглі дазволіць сабе камфортнае жыллё, культурны адпачынак і ўдзел у грамадскім жыцці.

**Жаночае пытанне і змены ў сямейных адносінах**

У другой палове XIX ст. жанчыны пачалі актыўна змагацца за свае правы. Рух за раўнапраўе ахапіў краіны Захаду, асабліва Вялікабрытанію, ЗША, Францыю і Германію. Асноўнымі патрабаваннямі былі: права на адукацыю і прафесійную дзейнасць; права на ўдзел у выбарах; роўныя ўмовы працы і аплата.

> Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, у якой краіне жанчыны ўпершыню атрымалі права ўдзельнічаць у выбарах.

Паступова жанчыны дасягнулі першых поспехаў: у шэрагу краін ім было дадзена права працаваць у дзяржаўных установах, займацца прадпрымальніцтвам, а напачатку XX ст. у некаторых краінах яны атрымалі права ўдзельнічаць у выбарах.

**5. Эканамічнае развіццё краін Захаду.** Другая палова XIX — пачатак XX ст. былі часам імклівага эканамічнага росту і тэхналагічных пераўтварэнняў у краінах Захаду. Гэты перыяд характарызуецца значнымі зменамі ў прамысловасці, гандлі і фінансах, што паўплывала на развіццё сусветнай эканомікі.

**Другая прамысловая рэвалюцыя**

Адным з ключавых фактараў эканамічнага ўздыму выступіла Другая прамысловая рэвалюцыя, якая ахапіла вядучыя індустрыяльныя краіны Еўропы і ЗША ў другой палове XIX ст.

**Індустрыялізацыя і яе наступствы**

У другой палове XIX ст. прамысловасць зрабілася асноўнай галіной эканомікі. Асаблівы рост *індустрыялізацыі* назіраўся ў такіх краінах, як Германія, Вялікабрытанія, ЗША і Францыя.

## ДРУГАЯ ПРАМЫСЛОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

**Пашырэнне электрычнасці**
дазволіла павысіць прадукцыйнасць працы, стварыць новыя віды тэхнікі (электрарухавікі, лямпы напальвання, тэлеграф, тэлефон)

**Развіццё хімічнай прамысловасці**
дало магчымасць вырабляць сінтэтычныя фарбавальнікі, угнаенні, фармацэўтычныя прэпараты і выбуховыя рэчывы

**Рост машынабудавання**
стварэнне паравых турбін, рухавікоў унутранага згарання, аўтамабіляў паскорыла механізацыю вытворчасці і транспарту

**Развіццё сталеліцейнай галіны**
спрыяла ўкараненню новых тэхналогій і актыўнаму будаўніцтву чыгунак

## ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ

| | |
|---|---|
| **Германія** | пасля аб’яднання ў 1871 г. імкліва развівала цяжкую і хімічную прамысловасць, а таксама машынабудаванне |
| **Вялікабрытанія** | заставалася сусветным прамысловым і гандлёвым лідарам, кантралявала суднабудаванне, а таксама значную частку сусветнай вытворчасці вугалю і тэкстылю |
| **ЗША** | напрыканцы XIX ст. ператварыліся ў найбуйнейшую індустрыяльную дзяржаву, былі лідарам у вырабе сталі, нафты і сельскагаспадарчай тэхнікі |
| **Францыя** | мадэрнізавала сваю эканоміку, павялічыла вытворчасць аўтамабіляў, электраабсталявання і тэкстылю |

Ці згодныя вы са сцвярджэннямі:
1) Другая прамысловая рэвалюцыя павялічыла нераўнамернасць развіцця краін;
2) Другая прамысловая рэвалюцыя з’яўляецца перадумовай Першай сусветнай вайны?
Сваю думку аргументуйце.

Рост індустрыялізацыі суправаджаўся павышэннем прадукцыйнасці працы дзякуючы ўкараненню канвеера і механізацыі. Развіццё чыгуначнага транспарту паспрыяла пашырэнню гандлю і эканамічнай інтэграцыі рэгіёнаў.

**Фарміраванне манаполій і буйных карпарацый**

Напрыканцы XIX ст. у эканоміцы краін Захаду ўзмацнілася канцэнтрацыя капіталу. Вядучыя галіны трапілі пад кантроль буйных кампаній, што прывяло да з'яўлення **манаполій** — аб'яднанняў прадпрыемстваў, якія кантралююць рынак, і росту банкаў і фінансавых груп, якія кіравалі інвестыцыямі і крэдытамі для прамысловасці.

**Манаполія** —
1) гаспадарчае аб'яднанне, якое засярodзіла ў сваіх руках большую частку вытворчасці і збыту нейкага тавару;
2) выключнае права дзяржавы, саслоўя або арганізацыі на гандаль або нейкую іншую сферу дзейнасці.

Дзякуючы развіццю транспарту, банкаўскай сістэмы і прамысловасці актывізаваўся міжнародны гандаль. У другой палове XIX — пачатку XX ст. назіралася актыўнае развіццё сусветных рынкаў, пашырэнне экспарту і імпарту тавараў; узмацненне каланіяльнай экспансіі, якая забяспечвала заходнія краіны сыравіннымі рэсурсамі і новымі рынкамі збыту; рост інвестыцый у прамысловасць і інфраструктуру, асабліва ў чыгункі, суднабудаўніцтва і энергетыку.

**6. Імперыялізм.** Ад канца XIX ст. пачынаецца эпоха **імперыялізму** — перыяд, калі вядучыя сусветныя дзяржавы імкнуліся пашырыць свой палітычны, эканамічны і ваенны ўплыў за кошт захопу калоній і кантролю над залежнымі тэрыторыямі. Гэты час характарызуецца ўзмацненнем барацьбы паміж вялікімі дзяржавамі за новыя рынкі, крыніцы сыравіны і сферы ўплыву.

**Імперыялізм** (манапалістычны капіталізм) — стадыя капіталізму, галоўнымі адметнасцямі якой з'яўляюцца панаванне манаполій і абвастрэнне барацьбы паміж дзяржавамі за сферы ўплыву ў свеце.

**Барацьба за калоніі**

Еўрапейскія дзяржавы актыўна каланізавалі Афрыку, Азію і астраўныя тэрыторыі Ціхага акіяна. У 1880–1914 гг. разгарнулася «Бітва за Афрыку» — імклівы падзел афрыканскага кантынента паміж Вялікабрытаніяй, Францыяй, Германіяй, Бельгіяй, Італіяй і Партугаліяй. У Азіі Вялікабрытанія ўмацавала сваю ўладу над Індыяй, Францыя захапіла Індакітай, за выключэннем Сіяма, а Германія здабыла кантроль над астравамі ў Ціхім акіяне і, таксама як і іншыя вялікія дзяржавы, атрымала сваю сферу ўплыву ў Кітаі.

Каланіяльныя дзяржавы ўсталёўвалі манаполію на прыродныя багацці захопленых зямель,

**Эканамічны кантроль над залежнымі тэрыторыямі**

выкарыстоўваючы іх як крыніцы сыравіны. Эканоміка калоній перабудоўвалася для абслугоўвання патрэб метраполій: будаваліся чыгункі і парты для вывазу рэсурсаў, развіваліся плантацыйныя гаспадаркі.

У шэрагу краін, такіх як Кітай, захоўвалася паўкаланіяльная залежнасць — фармальна незалежная дзяржава трапляла пад эканамічны кантроль еўрапейскіх краін.

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

У 1898 г. французскі мастак Ж. Меер стварыў карыкатуру «Кітай: пірог каралёў і імператараў».

1. *Разгледзьце карыкатуру. Якія падзеі былі асновай для яе стварэння?*
2. *Вызначце, прадстаўнікі якіх краін бяруць удзел у «дзяльбе пірага».*




**Ваенна-палітычнае спаборніцтва вялікіх дзяржаў**

Імкненне да захопу новых тэрыторый вяло да росту напружанасці ў адносінах паміж дзяржавамі. Англа-германскае супрацьстаянне асабліва абвастрылася, бо Германія намагалася пашырыць свае каланіяльныя ўладанні, пры гэтым адначасова навязвала гандлёвую канкурэнцыю Вялікабрытаніі. Ваенныя канфлікты, такія як англа-бурскія войны (1880–1881 гг., 1899–1902 гг.), руска-японская вайна (1904–1905 гг.), паказалі, што імперыялізм вядзе да ўзброеных канфліктаў.

**На шляху да сусветнай вайны**

Барацьба за сферы ўплыву ў свеце прывяла да стварэння ваенна-палітычных саюзаў (*Антанта* і *Траісты саюз*), сутыкненне інтарэсаў якіх

Успомніце, якія дзяржавы ўваходзілі ў склад Антанты і Траістага саюза.

выступіла адной з галоўных прычын Першай сусветнай вайны. Германія імкнулася перагледзець каланіяльны парадак, усталяваны Англіяй і Францыяй. Варожасць паміж дзяржавамі ўзмацнялася з прычыны падрыхтоўкі да вайны за перадзел свету. Імперыялізм зрабіўся адной з найважнейшых рыс сусветнай палітыкі, прадвызначыў глабальныя канфлікты XX стагоддзя.

**7. Традыцыйнае ўсходняе грамадства ва ўмовах каланіяльнай экспансіі.** Другая палова XIX — пачатак XX ст. былі часам сур'ёзных змен для традыцыйных усходніх грамадстваў, такіх як Кітай, Індыя, Іран, Асманская імперыя і краіны Паўднёва-Усходняй Азіі.

**Крызіс традыцыйнага грамадства**

Заходняя экспансія аказала велізарны ўплыў на іх эканоміку, сацыяльную структуру і палітычны лад. Каланіяльныя захопы, нераўнапраўныя дамовы і навязванне еўрапейскіх парадкаў прывялі да крызісу традыцыйных грамадстваў і росту супраціву ў іх.

Эканамічны ціск з боку каланіяльных дзяржаў прывёў да разбурэння рамесніцкай вытворчасці і традыцыйнага гандлю. Усходнія рынкі запаўняліся еўрапейскімі таварамі, а мясцовыя вытворчасці прыходзілі ў заняпад.

**Змяненне сацыяльнай структуры**

У калоніях фарміраваліся новыя пласты грамадства: праслойка адукаванай эліты, якая супрацоўнічала з каланізатарамі, а таксама збяднелае сялянства і рабочы клас.

**Спробы рэфармавання**

Рэформы прыводзілі да ўнутраных крызісаў. Напрыклад, спробы мадэрнізацыі ў Асманскай імперыі не здолелі ўратаваць яе ад аслаблення, а ў Кітаі рэформы канца XIX ст. выклікалі супраціўленне традыцыяналістаў.

Нарастанне залежнасці ад Захаду і пагаршэнне ўмоў жыцця прывялі да росту нацыянальнай самасвядомасці і супраціўлення каланізатарам.

## КАЛАНІЯЛЬНАЯ ЭКСПАНСІЯ

### ІНДЫЯ

Канчаткова ператварылася ў брытанскую калонію. Пасля падаўлення паўстання сіпаяў кіраванне краінай перайшло да брытанскай кароны. Каланіяльная адміністрацыя перабудавала эканоміку краіны ў інтарэсах метраполіі, арыентуючы яе на вытворчасць сыравіны для Вялікабрытаніі

### КІТАЙ

Трапіў у сферу ўплыву заходніх дзяржаў пасля паражэнняў у опіумных войнах. Нераўнапраўныя дамовы з Вялікабрытаніяй, Францыяй і іншымі краінамі прывялі да падзелу краіны на зоны ўплыву. Еўрапейцы кантралявалі парты, гандлёвыя шляхі і найважнейшыя галіны эканомікі

### АСМАНСКАЯ ІМПЕРЫЯ

Паступова страчвала тэрыторыі пад ціскам еўрапейскіх дзяржаў. Вялікабрытанія і Францыя атрымалі кантроль над Егіптам і Суэцкім каналам, балканскія краіны ўзмацнілі барацьбу за незалежнасць

### КРАІНЫ ПАЎДНЁВА-УСХОДНЯЙ АЗІІ

Трапілі пад уладу еўрапейцаў: Францыя захапіла В'етнам, Лаос і Камбоджу (Французскі Індакітай), Нідэрланды валодалі Інданезіяй, а Вялікабрытанія асталявалася ў Бірме і на Малакскім паўвостраве

## НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ

**Індыя:** Пасля падаўлення паўстання сіпаяў пачалася арганізацыя палітычнай барацьбы за незалежнасць. У 1885 г. быў створаны Індыйскі нацыянальны кангрэс, які пазней зрабіўся галоўным фактарам барацьбы за незалежнасць

**Кітай:** Адбываліся масавыя паўстанні: тайпінаў, накіраванае супраць маньчжурскай дынастыі Цын і заходняга ўплыву; іхэтуаняў («баксёраў») — народны рух супраць еўрапейцаў, падаўлены супольнымі сіламі заходніх краін і Японіі. Апагеем палітычнай барацьбы стала звяржэнне манархіі ў 1911 г. і ўсталяванне рэспублікі

**Асманская імперыя:** Рух младатуркаў. Яны выступалі за канстытуцыйныя рэформы і захаванне незалежнасці краіны, а ў 1908 г. учынілі рэвалюцыю, якая прывяла да аднаўлення Канстытуцыі 1876 г.

*Другая палова XIX — пачатак XX ст. былі перыядам маштабных змен як на Захадзе, так і на Усходзе. У заходніх дзяржавах сфарміраваліся сучасная партыйная сістэма і індустрыяльная эканоміка, што дазволіла ім актывізаваць каланіяльную экспансію ў Азіі і Афрыцы. Усход стаў перад складаным выбарам: адаптавацца да змен або змагацца за захаванне традыцыйнага ўкладу.*

| **калі ў свеце…** | **на тэрыторыі Беларусі…** |
|---|---|
| 1860–1880-я гг. — правядзенне буржуазных рэформаў Мэйдзі ў Японіі | 1860–1880-я гг. — правядзенне буржуазных рэформаў у Беларусі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія формы дзяржаўнага кіравання склаліся ў свеце да пачатку XX ст.? Ахарактарызуйце іх.
2. Якія ідэалогіі атрымалі пашырэнне ў XIX ст.? У чым сутнасць гэтых ідэалогій? Чым было абумоўлена фарміраванне дадзеных ідэалогій у XIX ст.? Якія з гэтых ідэалогій папулярныя ў цяперашні час?
3. Ахарактарызуйце працэс стварэння палітычных партый у другой палове XIX — пачатку XX ст. Чым былі абумоўленыя адрозненні ў фарміраванні палітычных сістэм Захаду і Усходу?
4. Якія змены адбываліся ў розных галінах жыцця заходняга грамадства ў другой палове XIX — пачатку XX ст.? Ці можна сцвярджаць, што ў гэты перыяд склаўся індустрыяльны тып грамадства?
5. Як змянілася эканамічнае становішча вядучых краін Захаду ў канцы XIX — пачатку XX ст.?
6. Назавіце прыкметы імперыялізму. У. І. Ленін характарызаваў імперыялізм як найвышэйшую стадыю развіцця капіталізму, пры якой пачынаецца барацьба за перадзел свету. Прывядзіце факты, якія пацвярджаюць або абвяргаюць гэтае меркаванне.
7. Ахарактарызуйце формы каланіяльнай экспансіі заходнееўрапейскіх дзяржаў у другой палове XIX — пачатку XX ст. Чаму краіны Усходу не маглі ім супрацьстаяць?